Караткевіч А.А.,
выкладчык

## РАЗВІЦЦЕ АСНОЎНЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ НАВЫКАЎ НА ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ НАВУЧАННЯ ІГРЫ НА ТРУБЕ

Выканаўчыя навыкі трэба развіваць з самага пачатку навучання ігры на трубе. Галоўным кампанентам музычных здольнасцей з'яўляецца музычны слых. З дапамогай музычнага слыху вучань кантралюе якасць гуку, чысціню строю і інтанацыю, дакладнасць метрарытму, моцнасць і тэмбр гучання, дынаміку і фразіроўку.

Труба з прычыны канструктыўных асаблівасцей мае недастаткова дакладную настройку асобных гукаў, а гэта перашкаджае дасягненню чысціні інтанацыі ў час ігры. Для пераадолення гэтых цяжкасцей патрэбны пастаянны слыхавы кантроль выканаўцы над кардынацыйнай работай вуснаў, языка, органаў дыхання, пальцаў і ўсяго выканаўчага апарату.

Для развіцця інтанацыйнага слыху музыкант павінен вывучыць асаблівасці свайго інструмента і валодаць дадатковай аплікатурай, што значна пашырае выканаўчыя магчымасці.

Кожны музыкант павінен умець правільна настроіць свой інструмент. У момант настройкі інструмента некаторыя выканаўцы пры дапамозе вуснаў спрабуюць павысіць альбо панізіць строй. Выкананая такім чынам настройка не зможа гарантаваць інтанацыйную ўстойлівасць.

Пры настройцы трубы патрэбна ўлічваць рад умоў:

а) зададзены гук настройкі павінен выконвацца цвёрдай атакай на падпорцы дыхання пры нюансе меццо фортэ;

б) нельга ў момант настройкі прыстасоўвацца да гучання асноўнага тону за кошт змянення становішча вуснаў;

в) дынаміка гучання асноўнага тону настройкі павінна быць стабільнай.

Развіццё музычнага слыху цесна звязана з развіццём пачуцця рытму. А выразнае значэнне рытму, у сваю чаргу, цесна звязана з тэмпам. Таму вучань пры выкананні гам і арпеджыо, п'ес і эцюдаў павінен строга прытрымлівацца зададзенай рытмічнай і тэмпавай асновы. Некаторыя выканаўцы ў пачатку заданняў прытрымліваюцца зададзенага тэмпу, а паступова к завяршэнню павялічваюць альбо памяншаюць яго. Гэты недахоп бывае не толькі ў пачынаючых, але і ў прафесійных музыкантаў, выкараніць яго неабходна ўжо ў пачатковы перыяд навучання.

Развіццё музычнай памяці прадугледжвае цца не толькі здольнасцю да запамінання музычных пабудоў і цэлых твораў, але і магчымасцю іх выканання. Чым больш нотнага тэксту студэнт вывучае на памяць, тым больш ён набывае навыкаў.

Пры навучанні ігры на трубе выкладчык павінен сканцэнтраваць увагу на развіцці ў пачынаючых выканаўцаў розных відаў памяці: слыхавой, зрокавай, тактыльнай, маторнай і лагічнай.

1. Калі навучэнец валодае здольнасцю ўспрыняць і ўвасобіць музычны твор, можна гаварыць, што ў яго развіта слыхавая памяць.

2. Развіваючы зрокавую памяць, педагог развівае ў навучэнца здольнасць мысленна бачыць унутраным зрокам старонкі нотнага тэксту твора з усімі яго падрабязнасцямі.

3. Тактыльная (адчувальная) памяць дае магчымасць праз датыканне канчыкамі пальцаў да клавіш, а таксама праз пачуццё звычнага руху вуснаў і рухомасці языка выклікаць у памяці неабходныя дзеянні для ўзнаўлення вывучанага твора.

4. Развітая маторная (мускульная) памяць дазваляе хутка ўспрымаць сігналы маторных цэнтраў галаўнога мозга, прыводзячых у рух мускульную сістэму выканаўчага апарату для аднаўлення музыкі.

5. Лагічная памяць неабходна для разумення зместу твора і заканамернасцей яго пабудовы.

На першапачатковым этапе развіцця навыкаў ігры на памяць выкладчык павінен звярнуць асаблівую ўвагу на падбор нотнага матэрыялу. Мелодыі песень і п'ес павінны быць не складаныя і даступныя кожнаму пачынаючаму музыканту. Гэта дазваляе эфектыўна развіваць выканаўчыя навыкі ігры на трубе.

Карацееў А.Л.,
дацэнт

## ВЫКАРЫСТАННЕ МАСТАЦКА-ВЫРАЗНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ АНСАМБЛЯЎ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ВЫКАНАЎЦАЎ НА ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАХ

Сучасная выканальніцкая практыка вызначае два асноўныя віды ансамбляў духавых інструментаў: 1) ансамбль аднародных інструментаў; 2) ансамбль змешаных інструментаў. Па форме гэта могуць быць дуэты, трыо, квартэты, квінтэты, секстэты і інш. Розныя варыянты выкарыстоўваюцца і пры фарміраванні выканальніцкага складу. Напрыклад, квартэт: дзве трубы, два трамбоны; дзве трубы, валторна, трамбон; квартэт труб, валторнаў, трамбонаў, кларнетаў, саксафонаў: сапрана, альт, тэнар, барытон і г.д.

Ансамбль аднародных інструментаў дэманструе мастацка-выразныя магчымасці спа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лучэння адных і тых жа інструментаў у плане тэсітурнага гучання, тэмбравага каларыту, дынамічнай градацыі і эбалансаванасці гучання, ідэнтычнасці штрыхавых камбінацый і да т.п. У ансамблі змешаных інструментаў, акрамя вышэйпералічаных магчымасцей, выяўляецца кантрастнае супастаўленне тэмбравых спалучэнняў на ўсіх узроўнях выкладання музычнага матэрыялу: мелодыя - акампанемент - кантрапункт - туці.

Увесь арсенал выразных сродкаў ансамбляў духавых інструментаў дазваляе гэтым саставам дасягнуць неабходнага ўзроўню і актыўна ўключыцца ў выканальніцкую практыку з мастацка значнымі канцэртнымі праграмамі або асобнымі канцэртнымі нумарамі. Як перавагу разгледжаных калектываў трэба адзначыць іх магчымасць выступлення на адкрытых эстрадах з рознажанравай праграмай (класічная музыка, арыгінальныя творы для ансамбляў духавых інструментаў, эстрадная і джазавая музыка).

Волкаў В.В.,
прафесар

## ВЫКАРЫСТАННЕ СУЧАСНАЙ МЕТОДЫКІ ІГРЫ НА МЕДНЫХ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАХ У МУЗЫЧНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ

Нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці метадычных прац і інструктыўнага матэрыялу, прысвечаных праблемам штодзенных заняткаў музыканта-выканаўцы на медных духавых інструментах, ёсць пытанні, якія да гэтага часу выклікаюць спрэчкі і ў адносінах якіх выказваюцца розныя, іншы раз супрацьлеглыя меркаванні. Да ліку такіх пытанняў адносяцца базінг і сістэма педальных гукаў.

У апошні час сур'ёзныя метадычныя дапаможнікі для медных духавых інструментаў, што выходзяць за мяжой, не абыходзяць пытанне аб выкарыстанні базінга. Гэты метад уяўляе і для нас безумоўны інтарэс, таму што выканаўца на духавых інструментах павінен умець іграць гукі розных высот не толькі на інструменце, асобна на мундштуку, але і на губах. Музыкант, які валодае навыкамі ігры губных гукаў, мае натрэніраваны моцны эластычны і ў той жа час паволны амбушур.

Не можа быць іграючага музыканта, перад якім рана ці позна не ўстала б пытанне аб прынцыпе і сістэме штодзенных самастойных заняткаў. Акрамя традыцыйных практыкаванняў, у якіх выкарыстоўваецца агульнапрыняты дыяпазон медных духавых інструментаў, існуе значная група штодзенных практыкаванняў з выкарыстаннем педальных гукаў. Дзякуючы гэтым практыкаванням адкрыліся новыя магчымасці ў развіцці гуку, рэгістраў, гнуткасці амбушура і губных мышцаў. Дадзеным практыкаванням прысвечаны работы Л.Маджыо, У.Эбі, Р.Сполдзінта, К.Гардона, Д.Стэмпта і інш.

Ігра на духавых інструментах звязана з пастаянным напружаннем амбушура. Таму ўсё часцей даводзіцца шукаць магчымасці для паслаблення губных мышцаў, магчымасці для актыўнага адпачынку, пасля якога можна зноў быць гатовым да выканання работы, якая патрабуе значных мышачных намаганняў. Адным са спосабаў актыўнага адпачынку губ і іх трэніроўкі з'яўляюцца практыкаванні з выкарыстаннем гукаў педальнага рэгістра. Яны могуць таксама служыць добрым дадатковым сродкам у штодзенных занятках разам з работай над вытрыманымі гукамі, губным легата, гамамі, арпеджыо, дапаможнай атакай і іншымі практыкаваннямі, агульнапрынятымі ў сістэме заняткаў выканаўцы на медных духавых інструментах.

Юрцэвіч Ф.В.,
дацэнт

## ПРЫМЯНЕННЕ ТСН У РАБОЦЕ З АНСАМБЛЕМ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

У сістэме музычнай адукацыі працэс выкарыстання тэхнічных сродкаў навучання застаецца пакуль што на ўзроўні 60-х гадоў. Акрамя праслухоўвання музычных твораў у грамзапісе альбо на магнітнай стужцы, выкладчыкамі музычных спецдысцыплін ВНУ тэхнічныя сродкі ў навучальным працэсе амаль што не ўжываюцца. Таму ўяўляюць цікавасць пэўныя крокі ў гэтым накірунку, што зроблены ў Беларускім універсітэце культуры.

Так, кіраўніцтва універсітэта набыло камп'ютэры, якія можна прымяняць у працэсе навучання студэнтаў музычных спецыялізацый. На кожнай з кафедраў музычнага накірунку ўжо шэраг выкладчыкаў займаюцца складаннем праграм для «музычнага камп'ютэра». Паняцце «музычны камп'ютэр» мае вельмі шырокі сэнс. Гэта не толькі камп'ютэр з маніторам, а таксама і прынтар, на якім магчыма друкаванне нотнага тэксту партый аркестравых інструментаў паасобку альбо аркестравай партытуры цалкам. Акрамя таго, да камп'ютэраў ёсць шмат прыставак, якія дастаткова падключыць нават да самага простага камп'ютэра маркі «IBM», каб ён стаў адпавядаць параметрам «музычнага камп'ютэра». Найбольш папулярнымі з прыставак праграмнага забеспячэння з'яўляюцца «CUBASE 2.1, 2.2, 3.2, 4.1» (альбо «FALCON»). Адным з неабходных дадаткаў да камп'ютэра павінны быць простыя клавішы, з дапамогай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ